Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

25 КАСТРЫЧНІКА 2024 г. ПЯТНІЦА № 209 (30343)

Беларусь стала партнёрам у БРІКС

Фота БелТА.

Аб гэтым Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка паведаміў у інтэрв'ю газеце «Известия». «Мы сталі партнёрамі — гэта абавязковая прыступка перад уступленнем у гэты клуб», — заявіў беларускі лідар.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Беларусь ідзе да вас з канкрэтнымі ідэямі і праектамі, якія прызначаны садзейнічаць вырашэнню агульначалавечых праблем»

Аляксандр Лукашэнка агучыў прапановы нашай краіны для БРІКС

Фота БелТА.

Заключны дзень XVI Саміту БРІКС у Казані праходзіў у фармаце «БРІКС плюс/аўтрыч». «БРІКС аўтрыч» — рэгіянальны фармат, які прадугледжвае прыцягненне да дзейнасці БРІКС суседзяў па рэгіёне дзяржавы, якая старшынствуе ў аб'яднанні. «БРІКС плюс» — больш глабальны фармат, які дае магчымасць прыцягваць да работы іншыя краіны. У 2017 годзе Кітай заклаў аснову фармату «БРІКС плюс», выступіўшы з ініцыятывай фарміравання «кола сяброў», якія б узаемадзейнічалі з БРІКС у пастаянным рэжыме.

Летась Беларусь падала заяўку на ўступленне ў сям'ю БРІКС. На ўчарашнім пасяджэнні Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка агучыў пазіцыі, якія Беларусь можа прапанаваць аб'яднанню, што займае ўсё больш значнае месца ў глабальным светаўладкаванні. СТАР. 2

КАРАТКА

- Намінальная налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў Беларусі ў верасні 2024 года склала Br2313,9.
- **Прадпрыемствы Гомельскай вобласці вырабілі імпартазамяшчальных тавараў на $755 млн у студзені—верасні 2024 года.**
- Ва ўсіх катэгорыях гаспадарак краіны, паводле даных на 24 кастрычніка, усяго намалочана збожжа з улікам рапсу больш як 9,96 млн тон.
- **Футбольная зборная Беларусі захавала за сабой 97-е месца ў новым рэйтынгу Міжнароднай федэрацыі футбола (ФІФА).**
- Беларускія школьнікі сталі пераможцамі першай у свеце вочнай Міжнароднай алімпіяды па экалогіі і пытаннях змянення клімату, якая адбылася ў Расіі на федэральнай тэрыторыі «Сірыус».

Выбары-2025

НА СТАРЦЕ ВАЖНАЙ ПАЛІТЫЧНАЙ КАМПАНІІ

7 лістапада пачнецца збор подпісаў за вылучэнне кандыдатаў у Прэзідэнты Беларусі

Працэс збору подпісаў працягнецца да 6 снежня. Дакументы аб рэгістрацыі ініцыятыўных груп для вылучэння кандыдатаў у Прэзідэнты трэба падаць не пазней за 1 лістапада. Такім чынам, Цэнтральная выбарчая камісія зацвердзіла каляндарны план арганізацыйных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Напярэдадні Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу прызначыла выбары кіраўніка дзяржавы на 26 студзеня 2025 года. Цэнтрвыбаркаму даручана ў межах сваіх паўнамоцтваў арганізаваць правядзенне прэзідэнцкіх выбараў і ажыццявіць кантроль за выкананнем выбарчага заканадаўства.

На пасяджэнні ЦВК быў зацверджаны лагатып выбараў.

153 тэрытарыяльныя і звыш 5 тысяч участковых камісій

«Пасля таго, як Палатай прадстаўнікоў быў дадзены старт выбарчай кампаніі, нам неабходна арганізаваць выбарчы працэс, у тым ліку правесці інфармацыйную работу сярод насельніцтва, давесці да ўсіх суб'ектаў электаральнай кампаніі патрабаванні заканадаўства, якое датычыцца арганізацыі і правядзення выбараў Прэзідэнта, — канкрэтызаваў падчас пасяджэння ЦВК старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Ігар КАРПЕНКА. — Асноўным дакументам, які традыцыйна зацвярджаецца пасля прызначэння выбараў, з'яўляецца каляндарны план арганізацыйных мерапрыемстваў, што адлюстроўвае асноўныя этапы падрыхтоўкі і правядзення выбараў, тэрміны іх ажыццяўлення і выканаўцаў».

Для арганізацыі правядзення выбараў Прэзідэнта будуць створаны 153 тэрытарыяльныя камісіі і больш за 5 тысяч участковых камісій. Як звярнуў увагу старшыня Цэнтрвыбаркама, пры фарміраванні камісій неабходна выконваць патрабаванні заканадаўства. Пры гэтым, па яго словах, мэтазгодна ўлічваць досвед удзелу грамадзян у арганізацыі і правядзенні выбарчых кампаній, веданне выбарчага заканадаўства і заканадаўства ў цэлым, уменне працаваць з людзьмі, арганізатарскія здольнасці і іншыя кампетэнцыі як прафесійныя, так і асабістыя. СТАР. 4

Актуальна

ЖЫЛЛЁВЫ «КВАДРАТ» ВА ЎЛАСНАСЦЬ

У апошнія гады колькасць чаргавікоў істотна памяншаецца

Павышэнне ўзроўню даступнасці жылля з'яўляецца адной з мэт праекта канцэпцыі дзяржаўнай жыллёвай палітыкі да 2030 года. Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва распрацавала праект указа Прэзідэнта, у якім прадугледжваюцца меры па ўзмацненні дзяржаўнай падтрымкі пры будаўніцтве жылля. Гэтыя змены важныя для ўсіх, паколькі датычацца сапраўды важнага пытання — камфортных умоў жыцця. СТАР. 13

Фота БелТА.

ISSN 1990 — 763X

«Беларусь ідзе да вас з канкрэтнымі ідэямі і праектамі, якія прызначаны садзейнічаць вырашэнню агульначалавечых праблем»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У сваім выступленні на саміце кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што за невялікі па гістарычных мерках перыяд аб'яднанне стала цэнтрам прыцягнення. Менавіта з ім усё больш і больш краін звязваюць свае ўяўленні аб справядлівым светаўладкаванні. «Такім светаўладкаванні, дзе забяспечваецца роўнасць суверэнных дзяржаў незалежна ад іх памераў, ваеннай і эканамічнай моцы. Дзе прызнаецца права кожнага самастойна вызначаць ідэалогію развіцця і праводзіць незалежную знешнюю палітыку», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«БРІКС — гэта супольнасць будучыні. Па сваім патэнцыяле яна можа наблізіць канец гісторыі дамінавання калектыўнага Захаду, які аказаўся няздольным несці адказнасць за цывілізаванае развіццё міжнародных адносін, — упэўнены Аляксандр Лукашэнка. — У сілах дзяржаў — удзельніц БРІКС зрабіць так, каб рэальныя рычагі ўплыву перайшлі ў рукі прагрэсіўнай сусветнай большасці».

«Мы поўнасцю падзяляем філасофію БРІКС. Беларусь ідзе да вас з канкрэтнымі ідэямі і праектамі, якія прызначаны садзейнічаць вырашэнню агульначалавечых праблем. Мы гатовы стаць актыўным удзельнікам аб'яднання», — заявіў беларускі лідар.

Фота БелТА.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь — традыцыйна адказны і эфектыўны партнёр. «Геаграфічнае становішча ў цэнтры Еўропы, вопыт і дасягненні дазваляюць з упэўненасцю гаварыць аб тым, што Беларусь стане яшчэ адным важным пазлам у вобразе будучыні нашай арганізацыі. Удзел Беларусі пашырае межы магчымасцяў аб'яднання, робячы яго больш універсальным і ўсёабдымным», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

АБ СФЕРЫ БЯСПЕКІ

У ліку кірункаў, у рэалізацыі якіх Беларусь можа адыграць важкую ролю, Аляксандр Лукашэнка ў першую чаргу назваў сферу бяспекі.

«Узаемная павага, непадзельная бяспека, гарантыі краінавага развіцця без канфрантацыі і супрацьборства — тыя прынцыпы, на якіх неабходна будаваць наш новы светапарадак, з нашага пункту гледжання», — сказаў Прэзідэнт.

АБ УСТОЙЛІВЫМ РАЗВІЦЦІ

«Для многіх краін глабальнай большасці, як і для нас, асабліва актуальная задача пабудовы ўстойлівых, эканамічна самадастатковых дзяржаў пры адсутнасці вялікіх запасаў прыродных рэсурсаў, геаграфічных і кліматычных пераваг. Беларусь з гэтым спраўляецца», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Ён заявіў аб гатоўнасці Беларусі прапанаваць свой гістарычны вопыт, як стаць мацнейшымі самім і зрабіць мацнейшымі іншых. «Як насуперак санкцыйнаму ціску і спробам «каляровых рэвалюцый» захоўваць і памнажаць чалавечы патэнцыял, забяспечваць высокія сацыяльныя стандарты і дастойную якасць жыцця, камерцыялізаваць інавацыі і хутка асвойваць тэхналогіі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

АБ БАРАЦЬБЕ З ГОЛАДАМ, БЕДНАСЦЮ, НАСТУПСТВАМІ ЗМЕНЫ КЛІМАТУ

Беларусь — адзін з вядучых сусветных экспарцёраў мінеральных угнаенняў, шырокага спектра харчовых тавараў, сельскагаспадарчых машын і тэхналогій.

«Мы ўносім свой уклад у забеспячэнне харчовай бяспекі ў свеце. Гатовы ўзаемадзейнічаць з калегамі ў галіне аграрнай навукі, па пытаннях адаптацыі сельгаскультур да змяненняў клімату, меліярацыі і ўключэння зямель у сельскагаспадарчы абарот», — заявіў на саміце кіраўнік дзяржавы.

АБ ГУМАНІТАРНАЙ СФЕРЫ

Беларусь гатова ўнесці свой уклад у развіццё супрацоўніцтва ў рамках БРІКС і па гэтым кірунку.

«Беларуская адукацыя цэніцца ў свеце: па дыпломы па самых запатрабаваных сучасных спецыяльнасцях да нас прыязджаюць прадстаўнікі больш як 110 краін. Важным фактарам паспяховага развіцця нашай суверэннай дзяржавы з'яўляюцца моцныя навуковыя школы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Сярод прыярытэтаў — энергаэфектыўныя тэхналогіі, нанаматэрыялы і новыя крыніцы энергіі, прамысловыя біятэхналогіі, медыцына і ІТ-сфера.

Беларусь таксама напрацавала шэраг кампетэнцый у аэракасмічнай галіне. «Гатовы ўносіць свой уклад у рэалізацыю ініцыятывы аб стварэнні спадарожнікавых сістэм БРІКС і ў далейшым — кансорцыума касмічных даследаванняў. Будзем рады дзяліцца вопытам і навукова-практычнымі вынікамі», — заявіў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў Беларусі склаўся высокі ўзровень узаемадзеяння і даверлівыя адносіны з абсалютнай большасцю краін — удзельніц саміту. «З многімі мы маем ужо доўгую гісторыю паспяховага супрацоўніцтва. Цяпер мы можам дапоўніць нашы напрацоўкі на двухбаковым трэку новымі дасягненнямі ў інтэграцыйным фармаце. Мінск пацвярджае поўную гатоўнасць да паўнапраўнага членства ў арганізацыі», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Паводле прэс-службы Прэзідэнта.

Добрая пляцоўка для дамоўленасцяў

Учора Прэзідэнт правёў шэраг міжнародных сустрэч

У інтэрв'ю кітайскаму тэлеканалу CGTN Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што БРІКС — «добрая пляцоўка для дамоўленасцяў. Не проста пазнаёміцца (мы ўжо знаёмыя з усімі), а для таго, каб выбудаваць нашы адносіны, выпрацаваць дарожную карту, план нашых адносін на перспектыву. Гэта вялікая справа для любой краіны. Тым больш для Беларусі». Магчымасцю сустрэцца і пагаварыць з лідарамі іншых краін наш Прэзідэнт карыстаўся і ў нефармальнай абстаноўцы. Большая частка размоў з замежнымі калегамі праходзіла ў кулуарах, «на нагах», у тым ліку падчас урачыстага прыёму для ўдзельнікаў саміту, які адбыўся ў сераду вечарам. На фатаграфіях з прыёму відаць, што Аляксандр Лукашэнка сядзеў за сталом побач з Прэзідэнтам Азербайджана Ільхамам Аліевым і Прэзідэнтам Кыргызстана Садырам Жапаравым. На іншай фатаграфіі з кулуараў Прэзідэнт Беларусі размаўляе з калегамі з Казахстана, Таджыкістана, Узбекістана і Кыргызстана. Перагаворы з лідарамі, што прысутнічалі на саміце, прайшлі і ўчора.

Разам — супраць заходніх санкцый

Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з Прэзідэнтам Ірана Масудам Пезешкіянам. Гэта была першая сустрэча з новым кіраўніком Ірана. Лідары краін цёпла прывіталі адзін аднаго. Іранскі прэзідэнт падкрэсліў, што рады магчымасці сустрэцца на палях саміту.

Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз павіншаваў калегу з пераканаўчай і бясспрэчнай перамогай на выбарах, вынікі якіх не маглі аспрэчыць нават на Захадзе. Ён запрасіў Масуда Пезешкіяна наведаць у зручны час Мінск, каб абмеркаваць перспектывы супрацоўніцтва. Тым больш што паміж бакамі ніколі не было закрытых тэм.

Таксама беларускі лідар падзякаваў іранскаму калегу за падтрымку ў наданні Беларусі статусу партнёра ў БРІКС. Прэзідэнт Ірана падкрэсліў, што БРІКС — гэта моцная група краін і разам можна процістаяць заходнім санкцыям.

Пачаць можна са зборкі тэхнікі

Аляксандр Лукашэнка на палях саміту БРІКС у Казані сустрэўся з прэм'ер-міністрам В'етнама Фам Мінь Цінем.

«Калісьці я вельмі настойліва прапаноўваў у час свайго візіту ў В'етнам ранейшым кіраўнікам стварацца сумесныя прадпрыемствы ў В'етнаме па вытворчасці беларускай тэхнікі. І далей — гандаль на рынку АТЭС», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «Можам пачаць са зборкі. Чаму ў гэтым плане не супрацоўнічаць? Гэта выгадна вам, гэта выгадна нам, і гэта выгадна краінам, у якія мы потым будзем прадаваць гэту тэхніку. І ў В'етнама ж патрэба вялікая, асабліва ў сельскагаспадарчай грузавой тэхніцы», — дадаў беларускі лідар.

«Мы вельмі актыўна з вамі супрацоўнічаем на міжнародных пляцоўках. У нас практычна няма ніякіх праблем. Мы ўзаемна падтрымліваем адзін аднаго. Дзесьці мы — В'етнам, дзесьці В'етнам — нас. Мы ў гэтым плане будзем працаваць і далей. Што да асновы нашых адносін, гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, у 2023 годзе мы дасягнулі вельмі высокага ўзроўню супрацоўніцтва і тавараабарот наш склаў больш як $250 млн», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Ён канстатаваў, што ёсць праблема ўзаемаразлікаў. «Мы, вядома, не хацелі, каб В'етнам з-за нас трапіў пад нейкія санкцыі. Хаця разумеем: В'етнам не так проста цяпер пакараць. Гэта вельмі магутная буйная развітая краіна», — адзначыў ён.

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што пытанняў, якія не вырашаюцца, няма, калі ёсць жаданне іх вырашыць. «Таму мы вельмі прасілі б вас, каб у час наведвання В'етнама кіраўнікамі Нацыянальнага банка Беларусі былі знойдзены прымальныя рашэнні для ўзаемаразлікаў», — прапанаваў ён.

«Нам, Антоніу, вельмі патрэбен мір»

На сустрэчы з генеральным сакратаром ААН Антоніу Гутэрышам беларускі лідар падарыў яму скульптуру буслоў.

«Мы за мірнае вырашэнне любых канфліктаў», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. «Гэта — сімвал міру. Нашы буслы. Нам, Антоніу, вельмі патрэбен мір», — сказаў Прэзідэнт, уручаючы падарунак.

У час сустрэчы кіраўнік дзяржавы перш за ўсё павіншаваў Генеральнага сакратара «з цудоўнай асаблівасцю». «Я назіраю ўжо не першага Генеральнага сакратара за сваё палітычнае жыццё. Але такую рашучасць я сустракаю ўпершыню», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. «Вы — першы Генеральны сакратар, які адкрыта і сумленна, як чалавек, заявіў аб сваёй пазіцыі па ключавых пытаннях міжнароднага парадку дня. Вы павінны ведаць, што ваша пазіцыя па Блізкім Усходзе не проста сугучная, абсалютна падтрымліваецца кіраўніцтвам Беларусі і мною ў тым ліку», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. «Вы павінны ведаць, што мы заўсёды будзем побач з вамі, што датычыцца (пытанняў. — **«Зв.»**) міру і вайны. Мы за мір, за мірныя перагаворы, за мірнае вырашэнне любых канфліктаў», — падкрэсліў беларускі лідар.

У сваю чаргу Антоніу Гутэрыш падзякаваў з кіраўніком беларускай дзяржавы, што напярэдадні яму давялося перажыць найбольш складаныя гадзіны жыцця ў якасці Генеральнага сакратара ААН. «Нашы калегі на Блізкім Усходзе папрасілі правесці тэрміновую нараду. Учора дрон пацэліў у машыну, якая належала арганізацыі ААН, і забіў вадзіцеля. У офісе ААН у Ліване дрон упаў настолькі блізка да будынка, што вылецелі шыбы», — расказаў ён.

«Нашы людзі перажываюць вельмі складаны час. Тым не менш яны прадоўжаць сваю работу, каб перадаць столькі гуманітарнай дапамогі, колькі яны могуць», — сказаў Генеральны сакратар.

Паводле БелТА.
Фота БелТА.

«Мы гатовы да выбараў і гатовы адказаць на любыя правакацыі»

Падрабязнасці інтэрв'ю Аляксандра Лукашэнкі выданню «Известия»

Тэма БРІКС была адной з першых, якую закранулі ў інтэрв'ю Прэзідэнта Беларусі выданню «Известия».

Аляксандр Лукашэнка расказаў у інтэрв'ю, што Беларусь стала партнёрам у БРІКС. «Мы сталі партнёрамі — гэта абавязковая прыступка перад уступленнем у гэты клуб», — заявіў беларускі лідар.

Паводле яго слоў, ён крыху здзіўлены тым фактам, што аб жаданні далучыцца да БРІКС заявілі каля 30 дзяржаў, а партнёрамі сталі крыху больш за дзесяць краін. «Партнёрамі сталі 12 або 13 дзяржаў, у тым ліку Беларусь. А чаму не прымаюць у БРІКС іншыя дзяржавы? Аб чым БРІКС хацела б, перш чым прымаць іншыя дзяржавы, падумаць? — паставіў пытанне беларускі лідар. — А чаму Турцыю не прыняць? Адзіны член НАТА, які праявіў цікавасць. Пры гэтым буйная краіна, эканоміка магутная. Чаму б не прыняць? Не, не прынялі».

«Добра, гэта (статус партнёра. — «Зв.») магчыма. Але мяне насцярожвае ў гэтым тое, каб бюракраты, якія робяць і прапаноўваюць кіраўнікам дзяржаў гэтыя дакументы, не завалакіцілі ўсё. Каб бюракратычны апарат не знішчыў тыя пытанні, якія сёння стаяць перад дзяржавамі, што ўваходзяць у склад БРІКС. Вось гэта мяне насцярожвае. Вось сабраліся, паказалі адзін аднаму, неяк выступілі і раз'ехаліся. А вынік?» — заўважыў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы заявіў у інтэрв'ю, што калектыўны Захад разгарнуў ашалелую барацьбу за паніжэнне статусу БРІКС.

«Некаторыя заявілі аб уступленні ў БРІКС, а потым узялі паўзу. Гэта ў тым ліку сведчыць аб тым, што супраць БРІКС разгорнута ашалелая кампанія. Злучаныя Штаты Амерыкі, калектыўны Захад (яны сябе так называюць) разгарнулі барацьбу за паніжэнне статусу БРІКС. Прыклады мы ведаем — ідзе ціск. Не буду называць гэтыя краіны, таму што гэта закрытая інфармацыя. Яны могуць казаць, што гэта не так. Але мы ведаем, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Прытым краіны, з якімі Расія і мы ў добрых адносінах. Гэта значыць, ідзе ціск: «Калі вы ў БРІКС, значыць, мы з вамі не будзем гандляваць, вы інвестыцыі, крэдыты не атрымаеце, мы створым вам складанасці і цяжкасці».

«Усе спалохаліся, пачалі гаварыць, што мы ледзь не ў процівагу ААН ствараем нейкую арганізацыю, — заўважыў беларускі лідар. — Калі ты баішся гэтай процівагі, ты не ўступай у БРІКС. А я вось асабіста хачу, каб была такая процівага, каб ААН заварушылася. Ці каб была арганізацыя — глабальная. А БРІКС усё ж такі прэтэндуе на глабальную арганізацыю, а не рэгіянальную. Гэта не ШАС (ШАС — рэгіянальная). Хачу, каб была такая арганізацыя, якая будзе процівагай ААН», — сказаў Прэзідэнт.

Ён растлумачыў, чаму незадаволены цяперашнім станам спраў у ААН: «Што мы там маем? Мы чаго грошы трацім? Там збіраюцца столькі дзяржаў для таго, каб з трыбуны выступіць? Пры пустой зале ў асноўным... Хацелася б, каб яна была эфектыўнай, каб Савет Бяспекі вырашаў пытанні, а не проста збіраўся там. Не спадабаецца амерыканцам — вета, усё — разышліся».

Кіраўнік беларускай дзяржавы ўпэўнены, што пытанні вайны і міру павінны вырашацца выключна на пляцоўцы ААН. «Калі ААН вырашыла вайну спыніць — спыніць. Гэта што, ёсць? Не. Амерыканцы папракаюць расіян. Ды чаго вы папракаеце? Колькі вайнаў вы развязалі і колькі канфліктаў вы сёння ведзяце! І колькі вайнаў вы яшчэ маеце намер ажыццявіць...» — заўважыў Прэзідэнт Беларусі. У якасці прыкладу такой палітыкі ЗША ён прывёў сітуацыю вакол Тайваня: «Яны гатовыя там — AUKUS (ваенна-палітычны блок. — **«Зв.»**) ствараюць — умяшацца і нешта нарабіць. Таму ААН не выконвае свае функцыі».

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што працэс наступлення шматпалярнага свету — гэта ўжо аб'ектыўная рэч, якая не залежыць ад нечага жадання.

У гэтай сітуацыі многія краіны думаюць, куды «прыхіліцца», з кім быць у саюзе і супрацоўнічаць, ці то з рэгіянальнымі, ці глабальнымі аб'яднаннямі.

У выпадку з БРІКС Аляксандр Лукашэнка лічыць важным, каб у аб'яднанні не было тармажэння пры вырашэнні ключавых пытанняў. А калі такое адбываецца, то ініцыятыву па прасоўванні працэсу павінны браць на сябе дзяржавы-заснавальніцы: «Трэба, каб кіраўнікі дзяржаў-заснавальніц, а іх пяць, узяліся за вырашэнне гэтага пытання, арганізавалі адпаведную групу, вычленілі галоўныя, агульныя пытанні. Тыпу плацежнай сістэмы, гандлю праз крыптавалюты, нацыянальныя валюты і гэтак далей. Лагістыка вельмі важная для гандлю і іншыя пытанні. Каб яны вычленілі гэтыя пытанні і прапанавалі шляхі вырашэння».

«Але калі мы заявілі аб стварэнні (у гэтым выпадку — новай альтэрнатыўнай плацежнай сістэмы. — **«Зв.»**), будзьце ласкавыя развіваць сваю задуму. Калі многія дзяржавы пачынаюць шукаць, а з кім быць, як жыць далей, БРІКС можа зрабіць свой важкі ўнёсак... Але трэба варушыцца. Нельга спыняцца. Я часта кажу: калі спынімся, то тыя, хто ідзе за намі, нас растопчуць. А тут небяспека ў тым, што, калі мы не рэалізуем задумы, не задаволім чаканні іншых дзяржаў, калектыўны Захад пераможа і будзе з нас проста смяяцца. І потым ужо глабальную арганізацыю (развіваць. — **«Зв.»**) або заявіць аб стварэнні глабальнай арганізацыі ў свеце будзе вельмі складана», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Што датычыцца Беларусі, Прэзідэнт падкрэсліў, што арганізацыя БРІКС — жаданая для краіны арганізацыя. «Мы будзем з імі працаваць, будзем рабіць свой унёсак у вырашэнне агульных пытанняў, якія стаяць перад намі, — сказаў ён. — БРІКС — гэта вельмі блізкія нам дзяржавы — Расія, Кітай, Эміраты і многія іншыя. Хацелася б, каб у нас такі ўзровень адносін з Індыяй быў. Мы выбудоўваем яго».

Адначасова кіраўнік дзяржавы лічыць, што ў БРІКС трэба больш прапаноўваць і абмяркоўваць агульныя для ўсіх пытанні. Гэта ўжо адбываецца. Напрыклад, у цэнтры ўвагі на саміце былі тэмы канфлікту ва Украіне, сітуацыя на Блізкім Усходзе. Але ўсё ж у выступленнях лідараў пакуль гучаць і многія прыватныя праблемы і пытанні, канстатаваў беларускі лідар.

Прэзідэнт сказаў у інтэрв'ю, што ў Беларусі гатовы да выбараў і адказаць на любыя правакацыі.

«Мы не выключаем, што могуць быць нейкія інсінуацыі, правакацыі і гэтак далей. Але вось гэтага (як у 2020-м. — **«Зв.»**) больш не будзе. Мы гэтага не дапусцім, бо ведаем, хто гэта робіць. Нядаўна, дзякуй Майку Пампеа, з якім мы сустракаліся (былы дырэктар ЦРУ, а потым кіраўнік Дзярждэпа), ён быў у Беларусі. Потым з Ваванам і Лексусам вашымі (расійскія пранкеры. — **«Зв.»**) ён заявіў: «Так, у нас у Беларусі не атрымалася каляровая рэвалюцыя», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Ну якія яшчэ доказы патрэбны, што ў нашы выбары ўмяшаліся і хацелі перавярнуць краіну? Я як Прэзідэнт вымушаны быў яе абараняць, і я яе абараняў. І мы яе абаранілі. Таму мы гатовы да выбараў і адказаць на любыя правакацыі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Беларусі таксама на палях саміту даў інтэрв'ю праграме «Цэнтральнае тэлебачанне» тэлекампаніі НТБ.

НА СТАРЦЕ ВАЖНАЙ ПАЛІТЫЧНАЙ КАМПАНІІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Фота БелТА

«Асноўнай задачай тэрытарыяльных камісій будзе праверка дакладнасці подпісаў, сабраных у падтрымку вылучэння кандыдатаў у Прэзідэнты, кантроль за дзейнасцю і дапамога ўчастковым выбарчым камісіям, якія, у сваю чаргу, працуюць са спісамі выбаршчыкаў, арганізоўваюць непасрэдна галасаванне на ўчастку і ўстанаўліваюць яго вынікі», — канстатаваў Ігар Карпенка.

Шырокая інфармацыйная работа

Для камісій па выбарах Прэзідэнта Цэнтральная выбарчая камісія распрацавала метадычныя дапаможнікі. Акрамя таго, ЦВК плануе навучыць трэнераў з рэгіёнаў, якія затым змогуць правесці адпаведныя навучальныя заняткі (трэнінгі) на месцах для кіраўніцтва і членаў участковых выбарчых камісій з мэтай аднастайнага прымянення імі выбарчага заканадаўства. У цяперашні момант вядзецца работа па стварэнні навучальнага відэафільма для ўчастковых камісій, які будзе дэманстраваць парадак правядзення галасавання, — па аналогіі з фільмам, падрыхтаваным да адзінага дня галасавання. Пасля фарміравання камісій будуць таксама праводзіцца семінары, нарады, якія датычацца асаблівасцяў правядзення выбараў кіраўніка дзяржавы.

«На кожным этапе кампаніі Цэнтральная камісія будзе прымаць пастановы, якія датычацца рэгістрацыі ініцыятыўных груп па вылучэнні кандыдатаў у Прэзідэнты, рэгістраваць кандыдатаў у Прэзідэнты, будзем вызначаць перадвыбарную агітацыю, — праінфармаваў Ігар Карпенка. — Падчас правядзення дня галасавання, натуральна, таксама будзем назіраць за гэтым працэсам і атрымліваць аператыўную інфармацыю».

Напярэдадні дня выбараў традыцыйна пачне працаваць інфармацыйны цэнтр Цэнтральнай выбарчай камісіі з мэтай аператыўнага інфармавання як выбаршчыкаў, так і назіральнікаў аб ходзе галасавання, прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі.

Такім чынам, як падкрэсліў старшыня Цэнтрвыбаркама, тлумачальная работа закране ўсіх удзельнікаў выбараў. «Для інфармавання грамадзян аб ходзе падрыхтоўкі і правядзення выбараў пастановы Цэнтральнай выбарчай камісіі будуць размяшчацца на афіцыйным сайце ЦВК, — дадаў ён. — Інфармацыя, вызначаная Выбарчым кодэксам, будзе накіроўвацца ў друкаваныя сродкі масавай інфармацыі для апублікавання, а таксама размяшчацца ў месенджарах, сацыяльных сетках Цэнтрвыбаркама».

Акрамя гэтага, у Цэнтральнай выбарчай камісіі будзе арганізавана дзяжурства супрацоўнікаў паводле рэжыму работы тэрытарыяльных камісій, у тым ліку і па суботах. З 1 лістапада 2024 года пачне працаваць кол-цэнтр.

Мінімум — 100 тысяч подпісаў

У адпаведнасці з каляндарным планам арганізацыйных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні выбараў Прэзідэнта Беларусі, не пазней за 31 кастрычніка 2024 года неабходна прадставіць у органы, якія ўтвараюць тэрытарыяльныя камісіі, дакументы аб вылучэнні прадстаўнікоў у іх склад. Правам вылучаць такіх прадстаўнікоў валодаюць палітычныя партыі, грамадскія аб'яднанні, працоўныя калектывы і грамадзяне ў колькасці дзесяці чалавек.

Як звярнуў увагу Ігар Карпенка, не пазней за 1 лістапада 2024 года неабходна падаць дакументы аб рэгістрацыі ініцыятыўных груп па зборы подпісаў для вылучэння кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь. «Адразу хачу нагадаць, што прэзідэнцкія выбары — гэта тыя выбары, дзе вылучэнне кандыдатаў ажыццяўляецца толькі адным спосабам — шляхам збору подпісаў грамадзян, — падкрэсліў ён. — Не менш як 100 тысяч подпісаў павінна быць прадстаўлена ў Цэнтральную выбарчую камісію для рэгістрацыі». Пры гэтым ініцыятыўная група павінна быць прадстаўлена колькасцю не менш як сто грамадзян.

Акрамя таго, падчас пасяджэння Цэнтральнай выбарчай камісіі заслухалі інфармацыю аб парадку акрэдытацыі і дзейнасці замежных (міжнародных) назіральнікаў. Іх акрэдытацыяй па традыцыі будзе займацца Міністэрства замежных спраў. Нацыянальныя назіральнікі на прэзідэнцкіх выбарах павінны будуць акрэдытавацца да 20 студзеня 2025 года.

Датэрміновае галасаванне на выбарах Прэзідэнта Беларусі пачнецца 21 студзеня 2025 года.

Таксама Цэнтрвыбаркам зацвердзіў візуальную канцэпцыю прэзідэнцкай выбарчай кампаніі 2025 года. Яна змяшчае лагатып прэзідэнцкай выбарчай кампаніі, інфармацыйныя плакаты і банеры, выкананыя ў адзінай стылістыцы, рэкамендацыі мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, выбарчым камісіям, сродкам масавай інфармацыі і іншым арганізацыям па выкарыстанні візуальнай канцэпцыі пры падрыхтоўцы і правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Выбарчых участкаў за мяжой не будзе

У размове з журналістамі старшыня Цэнтрвыбаркама падкрэсліў, што пасля правядзення адзінага дня галасавання выбарчае заканадаўства не памянялася. «Беларускім заканадаўствам не прадугледжана стварэнне ўчасткаў за мяжой, — звярнуў увагу Ігар Карпенка. — Для прэзідэнцкай кампаніі гэта таксама актуальна. Для тых грамадзян, якія, магчыма, прыедуць з-за мяжы, каб прыняць удзел у галасаванні і якія не маюць тут рэгістрацыі, мы арганізуем традыцыйна ўчастак у Мінску. Для таго каб наблізіць магчымасць прагаласаваць, магчыма, такія ўчасткі створым ва ўсіх абласных цэнтрах. Гэтыя пытанні адпрацуем з МЗС, атрымаем адпаведныя консульскія спісы. Калі такія грамадзяне палічаць неабходным прыехаць і прагаласаваць, яны змогуць прагаласаваць на гэтых участках. Але гэта тыя грамадзяне, якія не маюць на тэрыторыі Беларусі рэгістрацыі».

Кажучы аб бяспецы членаў выбарчых камісій, Ігар Карпенка патлумачыў, чаму ЦВК не публікуе персанальныя даныя членаў камісій. «З гэтай нагоды крыкаў вельмі шмат, асабліва за мяжой: чаму мы гэтыя спісы не надрукавалі, — канстатаваў ён. — Мы тыя спісы надрукуем, а потым ідуць патокі розных лістоў з пагрозамі не толькі гэтым людзям, але і ў адрас іх сем'яў, блізкіх, родных і гэтак далей. Навошта ж мы будзем падобнае дапускаць?»

Пры гэтым старшыня Цэнтрвыбаркама заўважыў: нягледзячы на тое што персанальныя даныя членаў выбарчых камісій публікавацца не будуць, гэта не значыць, што гэтыя людзі будуць інкогніта. «Яны будуць працаваць на ўчастках, у іх будуць бэйджы, — паведаміў Ігар Карпенка. — У выпадку пэўных пытанняў можна будзе звярнуцца да гэтых людзей».

Вераніка КАНЮТА.

Блізкая ўлада

ДАПАМАГЧЫ ЗНАЙСЦІ ВЫЙСЦЕ...

Савет Рэспублікі правёў адзіны дзень прыёму грамадзян у Магілёўскай вобласці

У чацвер члены Савета Рэспублікі правялі выязны прыём грамадзян ва ўсіх раёнах Магілёўскай вобласці. Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА працавала ў Бабруйску. На прыёме прысутнічалі таксама прадстаўнікі мясцовай улады, міністэрстваў, ведамстваў. Людзі прыехалі на прыём з розных абласцей. Усе пытанні, якія агучваліся, выццёвыя, і амаль усе ўзніклі не ўчора. Грамадзяне звярталіся ў розныя інстанцыі неаднойчы, некаторыя прайшлі праз суды.

Фота Бел!ТА.

Жыхар Кобрына Брэсцкай вобласці, напрыклад, не можа вырашыць праблему на працягу пяці гадоў. Ён паскардзіўся на нядобрасумленнага распрацоўшчыка сайта, які не выканаў паслугі.

— Заплаціў за распрацоўку сайта вялікія грошы і застаўся ні з чым, — перажываў ён.

Наталля Качанава падбадзёрыла мужчыну і паабяцала, што яго пытанне будзе дэталёва разгледжана. Малады чалавек прызнаўся, што вельмі крануты прыёмам і падзякаваў Старшыні Савета Рэспублікі за ўвагу да людзей.

Наогул, ніводны чалавек не пайшоў з прыёму пакрыўджаны. Людзі разумелі, што нават калі праблема вырашыцца не на іх карысць, усё будзе па законе. Некалькі пытанняў датычылася шматдзетных сем'яў.

На прыём з Мінска прыехала маці траіх дзяцей. Яна ў разводзе з мужам, і дамовіцца з ім па-мірнаму не атрымліваецца. Пры разводзе суд пакінуў за ёй і дзецьмі 56 % жылой плошчы, а за мужчынам — 44 %. Ён збіраецца прадаваць сваю долю і ўсяляк уздзейнічае на былую жонку і дзяцей, спрабуе выжыць з кватэры. І гэта пры тым, што кватэра пабудавана з улікам ільготнага крэдыту для шматдзетных. Заяўніца лічыць, што падзел зроблены несправядліва. Спікер Савета Рэспублікі адзначыла, што апошнім часам у Мінску перыядычна паступаюць аналагічныя звароты і гэта пытанне знаходзіцца ў зоне ўвагі Савета Рэспублікі.

Гэтыя і іншыя пытанні ўзятыя на ўлік Саветам Рэспублікі і будуць дасканала разгледжаны ў вызначаныя заканадаўствам тэрміны. Заяўнікі атрымаюць поўны і аргументаваны адказ на свае звароты.

— Нельга сказаць, што Магілёўская вобласць — лідар па зваротах, але з Бабруйска паступае найбольш зваротаў на фоне падобных гарадоў, — паведаміла **вядучы рэферэнт аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян сакратарыята Савета Рэспублікі Крысціна ПОБЫЛЬ.** — Пытанні ў рамках правядзення адзінага дня прыёму тыповыя. Магчыма, яны не глабальнага маштабу, але вельмі важныя для людзей. І ў ходзе кожнага прыёму Савет Рэспублікі імкнецца дапамагчы кожнаму. Адны з найбольш распаўсюджаных пытанняў — па зямельных і маёмасных адносінах, пытанні, якія закранаюць жыццёвыя інтарэсы кожнай сям'і, асобнага чалавека. Знайсці рашэнне ў рамках заканадаўства бывае няпроста. Спрабуем гэта рабіць з удзелам прадстаўнікоў органаў дзяржулады, рэспубліканскіх органаў кіравання. Людзі, якія пабывалі на прыёме, павінны атрымаць надзею, садзейнічанне ў вырашэнні праблем. Ім трэба растлумачыць сітуацыю, дапамагчы знайсці выйсце са складанай сітуацыі. Мы дапамагаем, і нам удзячныя, выказваюць словы падзякі. А некаторыя пытанні паспяваюць вырашыць яшчэ да пачатку прыёму. Гэта сведчыць аб эфектыўнасці падобных мерапрыемстваў.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Бабруйск.

Падрабязней аб тым, з чым ішлі жыхары Магілёўшчыны да членаў Савета Рэспублікі, — у наступным выпуску «Мясцовага самакіравання».

Міжнародны вектар

ВЫСОКІ ЎЗРОВЕНЬ ПАЛІТЫЧНАГА ДАВЕРУ

Ігар СЕРГЯЕНКА правёў сустрэчу з паслом КНР

Старшыня Палаты прадстаўнікоў павіншаваў Чжана Вэньчуаня з пачаткам дыпламатычнай місіі ў нашай краіне, выказаў упэўненасць у тым, што пасол ужо паспеў адчуць паважлівыя адносіны беларусаў да сябе, да кітайскага народа ў цэлым.

Фота Бел!ТА.

«Ваша краіна праводзіць самастойную, узважаную знешнюю палітыку, накіраваную на ўмацаванне супрацоўніцтва з многімі дзяржавамі, — канстатаваў Старшыня Палаты прадстаўнікоў. — Мы даражым сяброўствам з Кітайскай Народнай Рэспублікай. Дзякуючы лідарам нашых дзяржаў, паміж Беларуссю і Кітаем дасягнуты вельмі высокі ўзровень палітычнага даверу».

Ігар Сергяенка акцэнтаваў увагу на тым, што па ўзыходзячай траекторыі развіваюцца адносіны паміж парламентамі. Ён нагадаў, што сёлета быў дадзены старт рабоце Камітэта высокага ўзроўню па супрацоўніцтве паміж заканадаўчымі органамі Беларусі і Кітая. Дэлегацыя Нацыянальнага сходу на чале са Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй Качанавай у маі знаходзілася з візітам у КНР.

Па словах Старшыні Палаты прадстаўнікоў, Беларусь удзельнічае ў рэалізацыі шэрагу ініцыятыў, якія звязваюць стратэгічнымі інфраструктурнымі праектамі рэгіёны абедзвюх краін. Маючы на ўвазе праект «Адзін пояс — адзін шлях», Ігар Сергяенка падкрэсліў, што Беларусь чакае прыходу на наш рынак і іншых кітайскіх кампаній. Ён прывёў у прыклад і работу Кітайскага індустрыяльнага парка, на тэрыторыі якога паспяхова працуюць дзясяткі прамысловых прадпрыемстваў.

«Дынамічна развіваюцца і эканамічныя адносіны, — дадаў Ігар Сергяенка. — Па выніках мінулага года аб'ём гандлю вырас амаль на 33 %. Беларусь уваходзіць у дзясятку найбуйнейшых пастаўшчыкоў высакаякаснай харчовай прадукцыі, пашыраецца яе геаграфія. Яшчэ некалькі гадоў таму мы не маглі аб гэтым нават і казаць. Сёння гэта становіцца рэаліяй».

Спікер нагадаў, што ў канцы жніўня адбыўся афіцыйны візіт у Беларусь прэм'ера Дзяржсавета Кітая Лі Цяна, калі быў падпісаны сальдо пакет дакументаў, якія раскрываюць патэнцыял супрацоўніцтва ў гандлі, сферы інвестыцый, паглыбленні прамысловай кааперацыі, навукова-тэхнічнага ўзаемадзеяння і іншых галінах. У Беларусі, па словах спікера, распрацаваны адпаведны план, пратакол даручэнняў па выкананні ўсіх тых дамоўленасцяў, якія былі дасягнуты паміж прэм'ерамі дзвюх краін.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў выказаў спадзяванне, што падчас кадэнцыі пасла ў нашай краіне ў яго атрымаецца арганізаваць візіт Старшыні Пастаяннага камітэта Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў у Беларусь. У адрас спадара Чжаа Лэцзі прагучалі добрыя пажаданні.

У сваю чаргу **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Чжан ВЭНЬЧУАНЬ** перадаў спікеру прывітанне і добрыя пажаданні ад Старшыні Пастаяннага камітэта Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў, падкрэсліўшы, што кітайска-беларускія адносіны знаходзяцца на самым высокім узроўні. «Мы лічым, што кітайска-беларускія адносіны сталі ўзорам новага тыпу міжнародных адносін. Кітай і Беларусь заўсёды разглядаюць двухбаковыя адносіны са стратэгічнай вышыні і ў доўгатэрміновай перспектыве. Мы гатовы разам з нашымі беларускімі партнёрамі цалкам рэалізоўваць дамоўленасці паміж нашымі лідарамі і прасоўваць двухбаковае супрацоўніцтва наперад».

Пры гэтым дыпламат адзначыў, што вельмі важную ролю ў двухбаковых адносінах іграе супрацоўніцтва паміж заканадаўчымі органамі. Ён прапанаваў у далейшым абмяняцца вопытам у заканадаўчай галіне, каб яшчэ мацней абараняць карэнныя інтарэсы дзвюх краін.

Вераніка КАНЮТА.

Уражанні

«ЗАЎСЁДЫ ПАЧЭСНА ПАБЫВАЦЬ ТАМ, ДЗЕ ПРАЦУЕ ПРЭЗІДЭНТ»

Экскурсія навучэнцаў Школы міру і выхаванцаў Спецыялізаванага ліцэя Міністэрства ўнутраных спраў прайшла ў Палацы Незалежнасці. На мерапрыемстве прысутнічала больш за сто чалавек.

Палац Незалежнасці з'яўляецца рэзідэнцыяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Галоўны адміністрацыйны будынак краіны размяшчаецца ў паўночна-заходняй частцы беларускай сталіцы побач з плошчай Дзяржаўнага сцяга. Яго можна па праве назваць візіткай Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка ніколі не хацеў адасабляць Палац Незалежнасці ад гарадской забудовы, таму дзверы дадзенага аб'екта па асабістым распараджэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у вызначаны час адчынены для экскурсій.

Такім чынам, тут апынулася Дар'я Біцукова, навучэнка сярэдняй школы № 14 г. Маладзечна. Карэспандэнту «Звязды» яна расказала, чым Школа міру, у якой яна вучыцца, адрозніваецца ад любой іншай, а таксама падзялілася першымі эмоцыямі пасля экскурсіі па знакавым месцы нашай краіны.

«Сюды прыехалі работы, якія актыўна займаюцца як міратворчай, так і валанцёрскай дзейнасцю. Мы ўдзельнічаем у пошукавых работах, у велапрабегах, у прыборках помнікаў і абеліскаў. У нашай школе вельмі часта праходзяць урокі міру. Лічу, што быць міратворцам — вельмі цікава і важна, бо можна ўдзельнічаць у вялікай колькасці мерапрыемстваў, якія дапамагаюць захоўваць мір. Міратворчасць — гэта тое, што нас аб'ядноўвае і што нам па душы. Наведаць Палац Незалежнасці — вялікі гонар для мяне, я заўсёды хацела тут пабываць. Калі сказалі, што ў мяне ёсць магчымасць сюды прыехаць, я адразу ж пагадзілася і ні кроплі не шкадую. Тут вельмі маштабна і прыгожа, такога я яшчэ не бачыла».

Старшыня Маладзечанскай раённай арганізацыі ГА «Беларускі фонд міру» Святлана Чыжыкава расказала, які ўплыў школы міру аказваюць на далейшы лёс Беларусі.

«Нядаўна мы адкрылі тры Школы міру, таму што і дзецям, і дарослым міратворцам вельмі важна, у чые рукі ў будучыні перададуць нашу дзяржаву і хто будзе несці грамадзянскую адказнасць у далейшым і па станаўленні нашай краіны, і па яе росквіце. Фонд міру — адна з найстарэйшых грамадскіх арганізацый, ёй больш за 60 гадоў, таму нам вельмі дорага тое, чым мы займаемся. У нас шмат праграм сацыяльнай накіраванасці, вялікія міратворчыя праекты, патрыятычнае выхаванне моладзі. Апошняе з'яўляецца адным з ключавых кірункаў нашага руху».

Начальнік Спецыялізаванага ліцэя Міністэрства ўнутраных спраў, палкоўнік міліцыі Яўген Абрамовіч расказаў, наколькі радасна і важна было даведацца выхаванцам Спецыялізаванага ліцэя МУС пра тое, што яны трапяць у Палац Незалежнасці: «Сёння тут знаходзяцца выхаванцы Спецыялізаванага ліцэя МУС, якія маюць высокія вынікі ў вучобе, спорце і ў іншых дасягненнях ліцэя. Яны рыхтаваліся некалькі дзён да гэтага мерапрыемства. Пабываць у «сэрцы» нашай краіны, дзе працуе Прэзідэнт і дзе сустракаюць дэлегацыі рознага ўзроўню, — заўсёды пачэсна. Рабяты заслужылі гэтую паездку сваім розумам, вучобай, яны досыць эмацыянальна прымаюць удзел у экскурсіі і вельмі рады такой магчымасці».

Юныя экскурсанты былі вельмі прыемна ўражаны экскурсіяй — пра гэта сведчаць іх ўсмешкі, мноства сэлфі, а таксама жаданне разгледзець кожны элемент знакамітага будынка.

Яўген КСЯНДЗОЎ, фота аўтара.

З нагоды

Сустрэчы з любімым артыстам

У нядзелю 27 кастрычніка спаўняецца 80 гадоў з дня нараджэння савецкага і расійскага акцёра тэатра і кіно, народнага артыста РСФСР Мікалая Карачанцава. Згадваць кінамайстра ў тэлеэфіры традыцыйна будуць паказамі вядомых кінастужак з яго ўдзелам.

На тэлеканале «Беларусь 3» у раніш-нім эфіры запланаваны паказ мастацкага фільма «Чалавек з бульвара Капуцынаў» (СССР, 1987 г.) рэжысёра Алы Сурыкавай. У ім юбіляру дасталася роля каўбоя Білі Кінга, сябра Джоні Фёста (Андрэй Міронаў). Гісторыя пра чалавека, які паверыў, што менавіта кіно здольнае змяніць свет, дадаць яму прыгажосці і дабрыні, з'явілася на кінастудыі «Масфільм». І пасля сваёй сустрэчы з гледачом ён атрымаў не толькі яго любоў, але і ўзнагароды ад прафесійнай супольнасці. Так, у кастрычніку 1987 года кінастужкы прысудзілі прыз журы на I Усерасійскім кінафестывалі відовішчных фільмаў «Адэская альтэрнатыва», прыз «Жанчыны ў кіно» атрымала Ала Сурыкава на Міжнародным фестывалі ў Лас-Анджэлесе (1987 г.). У маі 1988 года «Чалавек з бульвара Капуцынаў» назвалі «адным з найлепшых фільмаў мінулага года» чытачы «Савецкага экрана», прысудзіўшы яму трэцяе месца. Акрамя згаданых артыстаў, у акцёрскім складзе фільма таксама былі задзейнічаны Міхаіл Баярскі, Аляксандра Якаўлева, Алег Табакоў, Ігар Кваша, Леў Дураў, Галіна Польскіх і іншыя. Словам, ёсць шмат прычын перагледзець кінастужку.

А на тэлеканале «Расія-Культура» ў нядзелю з удзелам Мікалая Карачанцава ўвечары нас чакае выпуск праекта «Астравы», дзе будзе магчымасць згадаць акцёра такім, якім яго любілі гледачы. Ён казаў пра сябе тады: «Я паставіў сабе невыканальную задачу — навучыцца ўсё рабіць у сваёй прафесіі. Я разумею, што ніколі да гэтага не дайду, але буду імкнуцца». І шалёны рытм жыцця, дзе былі рэпетыцыі, спектаклі, здымкі, канцэрты, сустрэчы з сябрамі і калегамі, праца з дзецьмі ў створанай ім Школе мастацтваў. І раптам усё спынілася ў ноч страшнай аварыі, якая нібы цытата з фільма «Цырк згарэў, і клоўны разбегліся», дзе ён сыграў некалі галоўную ролю...

Алена ДРАПКО.

ШАШКІ («Звязда»)

Выпуск № 229

З 6 да 9 кастрычніка ў санаторыі «Залатыя пяскі» (Гомельскі раён) пры падтрымцы Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь праходзілі адкрытыя рэспубліканскія камандныя спаборніцтвы па шашках-64 сярод юнакоў і дзяўчат 2008 г. н. і маладзей «Залатая восень». У турніры па швейцарскай сістэме ў дзевяць тураў сярод 56 шашыстаў перамог кандыдат у майстры Марк Акуловіч (Мінск). У камандным заліку наймацнейшымі сталі шашысты Мінскай СДЮШАР. На другім месцы госці з Арлоўскай вобласці РФ. Трэцімі фінішавалі гульцы з Віцебскай вобласці.

№ 156



№ 156 В. Варушыла (Мінск)
Белыя простыя: c1, g1, b2, d4, b6, h6, c7 (7)
Чорныя простыя: a3, g3, f4, a5, e5, f6, g7, b8, f8 (9)

№ 157 Г. Андрэеў (Латвія)
Белыя простыя: d2, a3, c3, a5, e5, b6, f6 (7)
Чорныя простыя: g3, f4, h4, d6, c7, d8, f8 (7)

У шашкі-100 кампазіцыі склаў Віктар Шульга (Мінск)

№ 158
Белыя простыя: 39, 33, 29, 19, 20, 13, 6 (7)
Чорныя простыя: 42, 38, 40, 17, 11, 15, 3 (7)

№ 159
Белыя простыя: 33, 34, 30, 24, 19, 6 (6)
Чорныя простыя: 42, 43, 38, 35, 17, 11, 9 (7)

Астатнія кампазіцыі складзены вядучым рубрыкі па правілах бразільскіх шашак.

№ 160
Белыя простыя: e5, g5, f6, h6 (4)
Чорныя простыя: c3, e3, g3, f4, c5, c7 (6)

№161
Белыя простыя: c3, e3, f6, h6 (4)
Чорныя простыя: g3, b4, h4, a5, d6 (5)

№ 162
Белыя простыя шашкі: f2, a3, c3, d4, h4 (5)
Чорныя простыя шашкі: g3, a5, e7, g7 (4)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваны.

Анонс: З 18 да 24 лістапада ў Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі (г. Мінск, вул. К. Маркса, 10) адбудзецца першая ліга чэмпіянату Беларусі па шашках-64.

Папярэднія заяўкі на ўдзел неабходна выслаць на belarusdraughts@gmail.com не пазней за 12 лістапада.

З лістоў чытачоў: «Дзякуем аўтарам і вядучаму за чарговы выпуск з цікавамі заданнямі, рашэнне якіх даставіла нам асалоду і жадане працягваць гэты занятак», — пішуць Ф. Карпей і Л. Жыхар.

Праверце свае рашэнні: Выпуск № 228 ад 11.10.2024 г.

№ 149 1. c1-d2 a3:c1 2. e3-f4 c1:g1 3. f4:f8 h4:f2 4. g5:e7 d8:f6 5. b6:e1 g1:b6 6. f8-b4 a5:c3 7. e1:d8+

№ 150 1. b4-a5 e5:g3 2. h4:f2 h6:f4 3. a5:g3 h2:f4 4. f2-e3 d4:f2 5. e1:e5+

№ 151 31. 31-27! 08-12 32. 25-20 14:25 33. 37-31 28:39 34. 34:43 25:34 35. 27-21 16:27 36. 31:04 10-14 37. 04-31 15-20 38. 31-48 23-28 39. 35-30 24:44 40. 26-21 17:26 41. 36-31 26:37 42. 48:50 +

№ 152 1. 35-30 24:35 2. 34-30 35:24 3. 28-23 19:39 4. 38-33 39:28 5. 32:05 21:41 6. 05:46 +

№ 153 1. c5-d6 e7:e3 2. f2:h8 g3-h2 3. h8-c3 a7-b6 4. c3-b4 h4-g3 5. b4-e1 b6-c5 6. e1:h4 c5-d4 7. h4-g5 d4-c3 8. g5-c1+

№ 154 1. f2-g3 h4:b6 2. a5:g3 a3:c5 3. g3-h4 f8:d6 4. h4:h8 d6-e5 5. h8:b6 a7:c5 6. d2-c3+

№ 155 1. b4-c5 d6:d2 2. f4:f8 b8:d6 3. f8:d8 a5:c7 4. d8:g1+

Першымі дакладныя адказы даслалі: І. Ананіч (Гродна), В. Арцюхін, Э. Дамброўскі, П. і В. Шульгі (усе Мінск), С. Рашэцін (Ашмяны), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва Мядзел), У. Панько (Камянец).

«Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013» e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru

Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.

Экаасвета

ЯК УТЫЛІЗАВАЦЬ БУДАЎНІЧАЕ СМЕЦЦЕ?

У Беларусі вядзецца рэестр аб'ектаў па выкарыстанні адходаў, у які ўваходзіць пералік юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія могуць прыняць на выкарыстанне адходы. У ім налічваецца 490 аб'ектаў па выкарыстанні будадходаў, з якіх 289 прымаюць адходы ад іншых арганізацый.

Напэўна, кожны хаця б раз сутыкнуўся з рамонтам кватэры або хаты ў вёсцы. Колькі ўсялякага смецця ўтвараецца пры гэтым! Рэшткі лінолеума, будаўнічых сумесяў, кавалкі труб, бітае шкло, цэгла... Як утылізаваць іх без шкоды для навакольнага асяроддзя?

Проста пакінуць у звычайных кантэйнерах для збору ДМР («Шкло», «Пластык», «Папера») і агульных адходаў

нельга. Будаўнічае смецце неабходна размяшчаць:

• у спецкантэйнерах — бункерах, якія ўсталёўваюць па заяўках ад уласнікаў смецця або спажыўцоў жыллёва-камунальных паслуг, арганізацый, якія ажыццяўляюць абслугоўванне насельніцтва;

• у спецыяльна адведзеных месцах на кантэйнерных пляцоўках або на спецпляцоўках для збору буйнагабарытных адходаў (КДА). Графік вывазу КДА і месцах, арганізаваных для яго збору, можна ўдакладніць у ЖРЭА або на афіцыйным сайце выканкама.

Перапрацоўка будадходаў садзейнічае скарачэнню расходаў на новае будаўніцтва, зніжае негатыўнае ўздзеянне на навакольнае асяроддзе, памяншае нагрузку на гарадскія палігоны. Напрыклад, кавалкі жалезабетону здрабняюцца ў друз, які ўжываецца для запаўнення катлаванаў, пры будаўніцтве дарог, падмуркаў пад складскія і вытворчыя памяшканні, а таксама ў якасці сыравіны для вырабу розных будаўнічых матэрыялаў. Толькі каля 10 % такога смецця ў нашай краіне з'яўляюцца непрыдатнымі для перапрацоўкі ў другасныя матэрыяльныя рэсурсы.

Зоя САЛАЎЁВА.
Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

Падрабязней аб тым, як вывозіць будаходы на месца пахавання і хто выконвае гэтую паслугу, чытайце ў штомесячным грамадска-палітычным, навукова-папулярным часопісе «Родная прырода». Падпісацца на яго можна праз аддзяленні сувязі «Белпошта» і на сайце Belpost.by, сістэму Belpressa.by, аўтаматызаваную сістэму АРІП і ў магазінах і павільёнах «Белдрук».

Будзьце ў курсе

Адходы ад уласнікаў смецця (фізічных асоб) прымаюцца на пахаванне пры прад'яўленні пасведчання асобы. Калі яны ўтварыліся ў ходзе рамонтна-будаўнічых работ, пры зносе пабудоў, якія належаць гэтай асобе, патрэбны копіі дазволу на перапланіроўку або знос збудавання, пашпарт забудоўшчыка або іншыя дакументы, якія пацвярджаюць утварэнне дадзеных адходаў.

Пры неабходнасці вывазу будадходаў на аб'екты пахавання (выкарыстоўваюцца для арганізацыі ізаляльнага пласта) неабходна спакаваць іх у спецыяльныя мяшкі, а буйнагабарытныя адходы (дзвярныя і аконныя канструкцыі, лінолеум і інш.) скласці асобна. Замовіць паслугу вывазу ў перавозчыка адходаў або аплаціць утылізацыю.

Беларусь 1

6.00, 7.15, 8.20 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00 Навіны.
8.15, 22.05 Зона Х (16+).
9.15 Галоўны эфір.
10.50, 12.25 Меладрама «Сыграй майго мужа» (12+).
13.25, 15.25 Меладрама «Ад лёсу не заракайся» (12+).
15.15, 18.45 Навіны рэгіёна.
17.45 Беларуская часінка.
